**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Астровенская сярэдняя школа Бешанковіцкага раёна імені К.А.Абазоўскага”**

Распрацоўка сцэнарыя ў рамках рэалізацыі інавацыйнага праекту
«Укараненне мадэлі выкарыстання драматызацыі як сродку духоўна-маральнага развіцця навучэнцаў (на прыкладзе традыцыйнага беларускага тэатра «Батлейка»)»

# *Старая «Рэпка» на новы лад*

***Аўтары:***
**настаўнікі пачатковай школы,**
**кіраўнікі рэсурснага цэнтра**
**па духоўна – маральнаму выхаванню**
**ўстановы адукацыі:**
**Кляменцьева Алена Анатольеўна**
**Шарко Валянціна Мікалаеўна**

аг. Астроўна
2023

## Рэкамендацыі да паказу казкі ў батлеечным тэатры

Усе лялькі да гэтай казкі могуць быць выраблены (звязаны з бавоўны ці сшыты з тканіны) ці вылеплены з пластыліну (ці адмысловага пластыліну, які дубянее пад уздзеяннем тэмпературы, можна выкарыстоўваць і тэхніку пап'емашэ) сумесна з дзецьмі. Да лялек неабходна прымацаваць кійкі ці пруты, за якія іх водзяць лялькаводы. Можна таксама выкарыстоўваць пальчаткавыя лялькі ў батлейцы.

**Неабходны рэквізіт:**
Бабка з Дзедам, якія жывуць на другім паверсе батлейкі, а потым сыходзяць за рэпкай на першы, дзе і адбываецца дзеянне.
Рэпка павінна складацца з частак – разламвацца на часткі – каб кожны мог адшчапіць па кавалку.
Музычнае суправаджэнне

**Дзеючыя асобы:**
Вядучы, дзяўчынка ці хлопчык.
Баба
Дзед
Жучка , сабака.
Каток
Унучка

## Паказ спектакля

**Вядучы**
Не ў замку, не ў палацы.
А ў старой драўлянай хатцы
Бабка з Дзедам разам жылі.
Жылі добра, не тужылі.
Разам елі, разам пілі,
разам у гарод хадзілі.
Ну дык вось, у тым гародзе –
Ведаць гэта не пашкодзіць –
Пасадзіў дзед неяк рэпу.
Увільготніў добра глебу,
Ускапаў, узрыхліў зямліцу,
Даў яшчэ ёй раз напіцца
Ды пайшоў сабе дамоў
З працы пачакаць пладоў.
Агратэхніка, канешне,
Дала вынік самы лепшы:
Рэпка вырасла на славу:
Вышэй плота, вышэй лавы,

Уся жоўтая, бы сонца,
Так і просіцца ў ваконца.
Як паспела, дзед прыйшоў,
Каб забраць яе дамоў.
Ірвануў раз, другі, трэці...
Што такое? Ані з месца!
Мусіць, трэба дапамога.

**Дзед**
Бабка! Выручай старога!

**Вядучы**
Як жа не дапамагчы?
Бабка кінула пячы,
Падхапілася ды к дзеду.
Сама думае:

**Баба**
К абеду,
Мабыць, будзе рэпа ў нас.
Наямося, ды за квас!

**Вядучы**
Падбягае... Штось не так:
Рэпа ў градцы, дзед – як грак,
Разгубіўся, ледзь не плача.
Баба ж з злосці ледзь не скача.

**Баба**
Ты чаго стаіш, дурны?
Хапай рэпу ды цягні!
Ужо даўно кіпіць у печы.
Ты ж займаешся тут нечым!

Пакуль Дзед і Баба сварацца, прыходзяць па чарзе Жучка (пачынае грызці рэпку і, адчапіўшы кавалак, збягае), потым  аток пачынае лізаць рэпку, а потым і Унучка адкусвае вялізны кавалак.

**Вядучы**
Раззлаваўся тут і дзед.

**Дзед**
Што крычыш, як наш сусед?
Паспрабуй сама вазьмі,
Гэту рэпу пацягні!

Гырчыць баба, бы індык.

**Баба**
Ты мужык ці не мужык?
Я тут буду рэпу рваць,
А ты што ж? Адпачываць?!
Ах, такі ты, растакі!

**Вядучы**
Крык ляціць ва ўсе бакі.

Жучка, Каток і Унучка з’елі ўсю рэпку, апошні маленькі кавалачак ухапіла Мышка.

**Вядучы**
Слова – дзед, а баба – два.
Ды сварыліся дарма:
Покуль сварка дагарэла,
Тую рэпку Мышка з’ела.
Не адна, вядома, з Жучкай,
З Коткай разам ды з Унучкай.
Паглядзелі дзедка з бабкай
На сваю пустую градку
І рашылі, што ўжо болей
Не пасварацца ніколі.